

# Пятрусь Броўка

1905–1980

...Цудоўна гучыць пейзажна-любоўная саната «Пахне чабор...». Верш прасякнуты элегічным пачуццём, у ім праз драматызацыю лірычнай інтанацыі раскрываецца туга чалавечай душы па былым каханні.

*А. Бельскі*

## ПАХНЕ ЧАБОР...

Хіба на вечар той можна забыцца?
...Сонца за борам жар-птушкай садзіцца,
Штосьці спявае пяшчотнае бор,
Пахне чабор,
Пахне чабор...

Лёгкія крокі на вузкай сцяжынцы.
Дзеўчына ў белай іскрыстай хусцінцы,
Быццам абсыпана промнямі зор.
Пахне чабор,
Пахне чабор...

Выйсці б насустрач, стаць і прызнацца.
Вось яно — блізкае, яснае шчасце,
Клікнуць хацелася — голас замёр.
Пахне чабор,
Пахне чабор...

Год адзінаццаць, а можа, дванаццаць
Сэрца баліць, што не здолеў спаткацца,
Сэрца нязменна хвалюе дакор.
Пахне чабор,
Пахне чабор...

Час той схаваўся за дальняй гарою,
Здасца хвілінай — яна прада мною...

Выйду. Гукаю. Маўклівы прастор.
Пахне чабор,
Пахне чабор...



1. Знайдзіце ў вершы слова, якое характарызуе эмацыянальны настрой твора.
2. Якімі вы ўяўляеце лірычнага героя твора і яго каханую? Падмацуйце свае разважанні радкамі з верша.
3. Назавіце фразеалагічны выраз, які сведчыць, што гэты верш — успамін пра даўняе, але незабыўнае каханне.
4. Якія параўнанні ў вершы гавораць пра тое, што пачуццё закаханасці паэтызуе, узвышае звычайныя з'явы?
5. Якім новым зместам напаўняецца рэфрэн (паўтор двух сказаў) у канцы кожнай страфы, якія пачуцці і эмоцыі выяўляе (надзеі, захаплення, шкадавання, светлага смутку...)?
6. Радок *«Выйду. Гукаю. Маўклівы прастор»* у сціслай форме перадае цэлую драматычную гісторыю пачуцця. Паразважайце, які сэнс схаваны ў гэтых словах.
7. Падбярыце эпітэты, якія, на ваш погляд, характарызуюць першае каханне.
8. Нядзіўна, што гэты верш стаў папулярнай песняй, вядомай у выкананні ансамбляў «Верасы», «Песняры» і інш. Пазнаёмцеся з адпаведнымі відэа- і аўдыяматэрыяламі. Якое выкананне вам больш спадабалася і чаму?



Правообладатель Акадэмія адукацыі

# ПАЭТЫЧНЫ СІНТАКСІС

Вершаванай мове ўласціва разнастайная будова сказаў і фраз. Гэта з'яўляецца важным сродкам мастацкай выразнасці. Акрамя ўжо вядомай вам антытэзы і паралелізму (кампазіцыйнага прыёму, пры якім дзве падобныя або процілеглыя з'явы раскрываюцца ў параўнанні, паралельна), да паэтычнага сінтаксісу адносяцца ***рытарычныя пытанні***, якія не патрабуюць адказу і нясуць у сабе сцвярджэнне («Хіба на вечар той можна забыцца?»), ***інверсія***, ці парушэнне прамога парадку слоў з мэтай вылучэння галоўнага («Сэрца нязменна хвалюе дакор»), разнастайныя ***паўторы*** ў пачатку ці ў канцы вершаваных радкоў.

***Рэфрэн*** — радок або некалькі радкоў, якія паўтараюцца ў творы ў нязменным выглядзе праз пэўную колькасць строф. У вершы Петруся Броўкі «Пахне чабор...» рэфрэн з'яўляецца яшчэ і падваеннем («пахне чабор, пахне чабор») — так узмацняецца роля мастацкай дэталі (прыемны водар, які выклікае адпаведныя ўспаміны).

? Прывядзіце прыклады паўтораў і рэфрэнаў з вывучаных вамі вершаў і растлумачце іх ролю.

## «З прыродай зліўшыся душой...»

# ПЕЙЗАЖНАЯ ЛІРЫКА

Чалавек заўсёды шукаў у прыродзе нешта сугучнае свайму настрою, сваім перажываням. І знаходзіў: ці ў радасным журчанні ручайка, ці ў светлай сонечнай раніцы, ці ў сумнай мелодыі восеньскага дажджу. Нават у звыклай змене пор года няцяжка заўважыць вехі чалавечага жыцця: дзяцінства, маладосць, сталасць і старасць.

***Пейзажная лірыка*** перадае ўражанні, пачуцці, выкліканыя з'явамі і малюнкамі прыроды. Чытаючы такія вершы, можна ўявіць знаёмыя карціны родных мясцін, адкрыць у звычайным сапраўдную прыгажосць. Пейзажная лірыка вылучаецца асаблівай маляўнічасцю, зрокавай выразнасцю, багаццем гукапісу — сродкамі, якія дапамагаюць убачыць і адчуць гармонію ў прыродзе.